**Спартыўнымі традыцыямі моцныя.**

На гарадскім стадыёне “Алімп” прайшоў 15-ты абласны турнір па футболе, прысвечаны памяці нашага земляка Г.А. Шуміка.




16-17 лютага за званне мацнейшай змагаліся чатыры футбольныя каманды: слонімская, “Неман-2” з Гродна, “Цэментнік” з пасёлка Краснасельскі і футбольны клуб “Шчучын”.

Нягледзячы на мароз, матчы прайшлі “горача”, ніводная з футбольных дружын не хацела саступаць. Асабліва цікавым і напружаным выдаўся фінальны матч, у якім сышліся футбольныя каманды “Неман-2” і “Цэментнік”.




Футбалісты прадэманстравалі выдатную фізічную падрыхтоўку і яскравую камандную гульню, да апошняга моманту было цяжка вызначыць пераможцу. Ва ўпартай барацьбе з лікам 1:0 перамаглі спартсмены з пасёлка Краснасельскі, другое і трэцяе месцы занялі гродзенскія і слонімскія футбалісты. На жаль, шчучынскія спартсмены не ўвайшлі ў тройку лідараў.

Удзельнікі турніру былі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Фінансавую падтрымку ў арганізацыі турніру аказаў завод “Аўтапровад”.

— Вельмі прыемна, што памяць аб маім сыне жыве, — гаворыць маці Г.А. Шуміка Ніна Аляксандраўна, якая таксама прыняла ўдзел у цырымоніі ўзнагароджання. – Вялікі дзякуй вам за тое, што працягваеце яго справу!